Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 24. Варыянт 7. Ч.1**

**Білет 24. Практычнае заданне. Гаспадарчае жыццё беларускіх зямель у IX - XIII стст. Шляхі ўзнікнення гарадоў, іх роля**

**Заданні склалі:**Руцкая Л.А., ДУА "Сярэдняя школа № 148 г. Мінска"

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Назавіце тып гаспадаркі, распаўсюджаны ў IX–XIII стст. у Старажытнай Русі.
2. Растлумачце, што неабходна было мець у гаспадарцы для абслугоўвання дамашняй вытворчасці?
3. Вызначыце адрозненні розных катэгорый насельніцтва Старажытнай Русі на аснове табліцы. Зрабіце вывад аб фарміраванні феадальных адносін беларускіх зямель у IX–XIII стст.
4. Ці можна сцвярджаць, што ў Сярэднявеччы гаспадарка ўсходніх славян развівалася марудна, але ў ёй адбываліся значныя зрухі? Аргументуйце сваю пазіцыю, абапіраючыся на прапанаваныя крыніцы.

**Крыніца I**

**З хрэстаматыі 6 кл. Рыбакоў Б.А. Рамяство Старажытнай Русі**
Пры натуральнай гаспадарцы, прынцыпам якога было "ўсё нараджаецца дома", шмат што выраблялася ў кожнай асобнай гаспадарцы і не ў выглядзе рамяства, а ў выглядзе хатняй вытворчасці. Да такога віду вытворчасці трэба аднесці вытворчасць адзення, абутку, хатніх рэчаў, земляробчага інвентару. Для гэтага патрэбны былі нескладаныя прылады працы, якія выраблялiся мясцовым кавалём: сякера, іголка, нож, склюд - вось, магчыма, і ўсё, што трэба было для абслугоўвання такой хатняй вытворчасці.

**Крыніца II**

**Катэгорыі насельніцтва Старажытнай Русі**

| **Вольныя** | **Часткова вольныя** | **Часова несвабод-ныя** | **Залежныя (рабы)** |
|---|---|---|---|
| Супольнікі («людзі») | Смерды | Закупы | Халопы (чэлядзь) |

**Крыніца III**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Гаспадарчая дзейнасць. Мініяцюра з летапісу**

